# ЗМЕСТ


Пачатак доўгага шляху . . . . . . . . . . . . . . . . 7

Раней бананы мелі сілу . . . . . . . . . . . . . . . 10

Падарожжа без карты . . . . . . . . . . . . . . . . 14

Кветкі бэзу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 31

Барацьба з лейкеміяй . . . . . . . . . . . . . . . . 38

Незабыўныя ўспаміны . . . . . . . . . . . . . . . . 61

Знаходзячы надзею . . . . . . . . . . . . . . . . . . 78

Пасля падарожжа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 87

# ПАЧАТАК ДОЎГАГА ШЛЯХУ

Надышло новае стагоддзе, але дагэтуль на зямлі распальваюцца войны. У дзень, калі пачалася страшная вайна ў Іраку, мне прыгадаліся словы адной маці. Пачуў я іх у беднай краіне пад назвай Рэспубліка Беларусь, у правінцыйным мястэчку, і былі гэта словы зусім нечаканыя.

«Чалавек можа быць удзячны нават тады, калі згубіць самае каштоўнае на свеце». Няхай нашы мовы, гісторыі, рэлігіі і культуры такія розныя, людзі ўсё роўна здольныя зразумець адно аднаго... Я даведаўся, як адчуць чужыя няшчасці, боль і радасць, а навучылі мяне гэтаму ананасы, знойдзеныя пад снегам.


バナナ屋



# РАНЕЙ БАНАНЫ МЕЛІ СІЛУ

У нашых мясцінах ёсць дзіўнаватая крама пад назвай «Бананавая». Калі вы паедзеце на поўнач па шашы нумар дванаццаць, а потым — праз прэфектуру Яманасі да горада Сінсю і праз увесь горад Фудзі, то дабярацеся да горада Ціна, дзе жыву я. Праедзеце яшчэ старую паштовую станцыю Канадзава — і вось ён, чакае вас: невялікі горны перавал. Спу́сціцеся з перавалу ў мястэчка Томікава і знойдзеце там патрэбную краму. «Ну як мы вам? Як?» — быццам пытае наведнікаў шыльда, што стаіць перад ёй. Хоць крама і называецца «Бананавай», прадаюць у ёй не толькі бананы. У гэтым старым будынку гандлююць збольшага гароднінай, іншай ежай ды самымі рознымі таварамі.

Калі я праходжу паблізу, заўсёды думаю: «Як тут добра!» Чамусьці мне раптам робіцца весела. Мінулі часы, калі адна толькі гронка бананаў уздымала прэстыж крамы.

Даўней бананы мелі сваю сілу. Я нарадзіўся пасля вайны і належу да пакалення так званага «бэбі-буму». Цяпер у Японіі ўсім усяго хапае, але тады людзі не мелі нічога. Калі я хадзіў у пачатковую школу, мы елі бананы толькі ў адмысловых выпадках: на спартыўных святах, на экскурсіях... Бывала гэта звычайна раз на год. Памятаю, гэткія дні падаваліся мне асабліва вясёлымі. Я даядаў свой банан, і мне нават не хацелася выкідаць скурку. Гледзячы на яе, я паўтараў пра сябе: «Сёння я з’еў банан!» — і цэлы дзень адчуваў, што цела маё напоўненае сілай. Часы былі бедныя, але шчаслівыя. Цяпер у Японіі можна есці кавуны не толькі летам, але і зімой. Не толькі бананы ці ананасы, але і папаю, і манга — любую



садавіну лёгка прыдбаць, а вось часы надышлі, здаецца мне, нядобрыя.

*— Саёнара!**

*— До свидания!***

На развітанне прафесар фізікі Кузняцоў узяў мяне за руку і сказаў:

— Шчасце ўсяго свету не вартае адной слязінкі на шчацэ нявіннага дзіцяці...

Усё пачалося менавіта з ягоных слоў.

---

* Бывайце! *(яп.) — Тут і далей заўвагі А. Пятровіч.*

** У арыгінале па-руску.